*Таццяна Прохарцава*

**ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫЯ МАТЫВЫ
Ў ІЛЮСТРАЦЫЯХ ГЕОРГІЯ ПАПЛАЎСКАГА ДА ПАЭМЫ ЯНКІ КУПАЛЫ «ЯНА І Я»**

Выкарыстанне фальклорных матываў у ілюстрацыях да паэмы Янкі Купалы «Яна і Я» абумоўлена паэтычным матэрыялам, сугучным з народным эпасам, з лірычным фальклорам беларусаў. Георгій Паплаўскі аб'яднаў у творах, напісаных для паэмы Я. Купалы «Яна і Я», лірычна-рамантычны настрой вершаў і, як адзначае мастацтвазнаўца Л. І. Акімава, адметныя рысы стылю «мадэрн», у перыяд бытавання якога была напісана паэма, алегарычнасць фальклорных вобразаў і этнаграфічную дакладнасць прадметаў побыту [1, с. 113]. Мастак стварыў не проста шэраг ілюстрацый, прывязаных да канкрэтнага тэксту, а самастойную графічную серыю, якая складаецца з афортаў, аб'яднаных адзінай стылістыкай і тэмай.

Для аздаблення выдання мастак выканаў ў тэхніцы афорту («сухая ігла») сем палосных ілюстрацый і супервокладку. Як піша сам аўтар, гэтая тэхніка дае «аркушу вытанчанасць, аксамітнасць, мяккасць. <...> Ілюстрацыям да рамантычнай паэмы мне хацелася надаць узнёслае адценне» [2, с. 194]. Рамантычнасць купалаўскай лірыкі мае народны пачатак, тоіць у сабе фальклорныя матывы. Стыль напісання паэмы – просты, лаканічны, набліжаны да народных спеваў, абрадавых песняў, замоваў, заклікаў. Разам з тым, лірычнасць, узнёсласць і рамантычная лёгкасць вершаў абумовілі стылістыку выканання ілюстрацый да паэтычнага твора Я. Купалы.

Адметныя рысы стылю «мадэрн», характэрнага для пачатку XX стагоддзя - цякучасць, плаўнасць ліній, алегарычнасць вобразаў, – прысутнічаюць у сваіх афортах. Г. Паплаўскі здолеў удала аб’яднаць у графічнай серыі фальклорна-этнаграфічную дакладнасць і алегарычна-паэтычную ўмоўнасць. На аркушы для супервокладкі мастак размясціў этнаграфічныя элементы: грэбні для часання ільну, серп, саламяны кораб, ліру. Ліра сімвалізуе духоўнасць лірніка, які, паводле народнага ўяўлення, з’ўляецца носьбітам ідэй дабра, справядлівасці, выразнікам сялянскіх думак [3, с. 290]. Дыяганальная кампаноўка аркуша нагадвае бег крыніцы, што сімвалізуе чысціню, жаночую плоднасць і, паводле народных вераванняў, мае лекавую, цудадзейную сілу. Матыў крыніцы мастак выкарыстоўвае ў некалькіх афортах, што ілюструюць найбольш лірычныя часткі паэмы: такія кветкавыя крыніцы» мы бачым на ілюстрацыях да вершаў «У хаце», «Вяснянка», «Сяўба». Адметна, што ў аркушы да верша «Краса свету» графік малюе плаўную дыяганальную паласу – «крыніцу», не з кветак, а з дубовага лісця. Вядома, што ў фальклоры дуб сімвалізаваў лёс, у міфалогіі – вечнае жыццё [4, т. 1, с. 441]. Такі мастацкі ход бачыцца нам невыпадковым, бо сам верш тоіць у сабе алегорыю вечнай сялянскай мары аб светлай долі і волі, аб вечным шчасці.

Этнаграфічная дакладнасць прадметаў побыту, народных касцюмаў (вопраткі) была неабходна графіку для перадачы нацыянальнай спецыфікі, прыналежнасці галоўных герояў да сялянства. Мастак увасобіў у ілюстрацыях адносіны паміж хлопцам і дзяўчынай, паміж паэтам і роднай зямлёй. «Яна» – не толькі любімая жанчына, гэта сімвал Радзімы» [2, с. 194]. Найбольш удала гэтыя адносіны перададзены ў ілюстрацыі да верша «Краса свету». Імкненне беларускага народу да «волі сільнай», барацьбы з бяспраўем – такі настрой верша дае мастаку магчымасць вырашыць другі напрамак адносінаў у паэме (паэт – Радзіма) алегарычна-сімвалічным увасабленнем вобразаў верша. Героі паэмы паўстаюць ужо дарослымі людзьмі, якія смела сустракаюць свой лёс і гатовы змагацца за волю. Лірнік сімвалізуе гэта імкненне, народную думку аб справядлівасці, якая нарэшце ірвецца з сялянскіх вуснаў да ўсіх народаў. Дзяўчынка з калоссем паўстае сімвалам будучыні краіны, маладая жанчына з дзіцём – сімвал роднай Беларусі, гаспадар – абаронца волі. Мастак умоўна падзяліў аркуш на дзве часткі: народ з лірнікам і дзяўчынай з аднаго боку, і маладая сям’я з другога. Аб’ядноўвае аркуш цёмная паласа ў цэнтры кампазіцыі, у якую часткова ўпісаны фігуры лірніка і маладой жанчыны, на заднім плане даецца ледзве заўважная выява селяніна з віламі. Хвалістая паласа з дубовага лісця ў правай частцы кампазіцыі дабавіла дэкаратыўнасці і ураўнаважыла аркуш. Удалае спалучэнне цёмных і светлых плям, дакладнае выкарыстанне дэкаратыўных элементаў, высокапрафесійнае валоданне лініяй стварае закончаную кампазіцыю, што з’яўляецца самастойным мастацкім творам і, разам з тым, дае графічны вобраз верша.

У аркушы «Кросны» Г. Паплаўскі з этнаграфічнай дакладнасцю малюе кросны, чаўнок, але, каб перадаць узнёслы настрой паэмы, стварае рамантычны вобраз маладой жанчыны і кампануе тканае палатно накшталт аркі, што арганізоўвае кампазіцыйную прастору. Такім чынам мастак падкрэслівае лірычнасць паэтычных радкоў.

У ілюстрацыі да верша «Радуніца» мастак дакладна перадае абрад шанавання продкаў. Абрыс крыжа, што ўтвораны са ствала дрэва, галін і крыжоў на могілках, падкрэслівае сімвалічнасць дзеяння. Белая фігура хлопца на цёмным фоне і цёмная хустка дзяўчыны на светлым напамінаюць пра дуалістычнасць абраду – шанаванне жывымі памерлых, адносіны паміж гэтым і тым светам [4, т. 2, с.414 – 415].

Цікавае рашэнне прапануе графік у ілюстрацыі да верша «Бялісь, палатно: возера» з раскладзеным па беразе палатном уяўляе сабой сонца – сімвал дабра і ласкі [4, т. 2, с. 549]. Да таго ж сонца ўяўляе сабой жаночы пачатак (месяц – мужчынскі) [4, т. 2, с. 550]. Мастак выкарыстоўвае і этнаграфічныя элементы – кадушку і пранік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. Паплаўскі невыпадкова ў аркушы да верша «Сяўба» малюе гераіню ў святочнай вопратцы. Здаўна ў беларусаў хата і поле атаясамліваліся, былі двуадзіным вобразам [3, с. 206]. Таму на першую сяўбу сяляне ішлі чыстыя, у прыгожай вопратцы, а хату прыбіралі, як на свята. У гэты дзень праваздзілі абрад «засевак» – сеялі збожжа з вянка, што плялі на мінулагодняі Дажжынкі [4, т. 1, с. 526]. Хвалістыя палосы з кветак (у тым ліку, васількоў) ствараюць напамін пра гэты абрад.

У аркушы да верша «Вяснянка» мастак выкарыстоўвае фальклорныя вобразы вянка, васілька і птушкі (бусла). Вяснянка – веснавая песня, што спявалася пад час абраду Гукання вясны» [4, т. 1, с. 315 – 316], вянкі з васількоў плялі на Купалле, гэту кветку абавязкова ўпляталі ў вясельны вянок [3, с. 125]. У лірычных народных песнях васілёк быў сімвалам дасканаласці, дабрыні і чысціні [3, с. 125]. Бусел увасабляў паняцце гармоніі чалавека і прыроды. Мастак выкарыстоўвае вянок з васількоў, каб падкрэсліці чысціню і дасканаласць зносін паміж дзяўчынай і хлопцам, бусел сімвалізуе гармонію зносін селяніна і роднай зямлі [4, т.1, с. 197].

Такім чынам, фальклорны пачатак ілюстрацый абумоўлены паэтычным матэрыялам, сугучным з народным эпасам, з лірычным фальклорам беларусаў. У афортах мастак Г. Паплаўскі выкарыстаў разнастайныя фальклорныя матывы і вобразы крыніцы, вянка, птушкі (бусла), кветкі (ружы), дрэва (дуба), і этнаграфічныя элементы – кросны, шыяны, пранікі, народны касцюм, стварыўшы адметную графічную серыю, што аб'яднала ў сабе фальклорна-этнаграфічную і алегарычна-паэтычную стылістыку паэмы.

**Спіс літаратуры:**


1. Акимова, Л.И. Георгий Поплавский : Живопись. Графика [альбом] / Л. Акимова. – М. : Совет. худож., 1986. – 135 с.
2. Поплавская, Н.Н. Георгий Поплавский. Романтик сурового стиля: живопись, графика, книжная иллюстрация [альбом] / Н. Поплавская ; авт. текстов И. Авдеев [и др.]. – Минск : Четыре четверти, 2010. – 249 с.
3. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя ; рэдкал.: І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 375 с.
4. Беларускі фальклор : энцыклапедыя: у 2-х т. Т. 1: Акапэла – Куцця / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2005. – 768 с.
5. Беларускі фальклор : энцыклапедыя: у 2-х т. Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – Яшчур / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2006. – 832 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ